Весці БДПУ. Серыя 2. 2022. № 2. С. 67–71

*УДК 94(37)*

# СІНКРЭТЫЗМ І ТРАДЫЦЫЯ Ў РЭЛІГІЙНАЙ ПАЛІТЫЦЫ ІМПЕРАТАРА ЭЛАГАБАЛА

**С. М. Смірноў,**
*аспірант кафедры гісторыі старажытнага свету і сярэдніх вякоў БДУ*

*UDC 94(37)*

# SYNCRETISM AND TRADITION IN RELIGIOUS POLICY OF THE EMPEROR ELAGABALUS

**S. Smirnou,**
*Postgraduate Student of the Department of History of Ancient World and Middle Ages, BSU*

Паступіў у рэдакцыю 20.01.22.

Received on 20.01.22

Артыкул прысвечаны аналізу агульных асаблівасцей рэлігійнай палітыкі рымскага імператара Элагабала на аснове звестак рымскіх гісторыкаў, эпіграфічнага і нумізматычнага матэрыялу. Разглядаецца рэлігійная рэформа Элагабала як радыкальная спроба падтрымаць сінкрэтычныя тэндэнцыі ў духоўнай культуры Рымскай імперыі.

*Ключавыя словы:* рэлігійная палітыка, сінкрэтызм, традыцыяналізм, салярны культ, Рымская імперыя.

The article is devoted to the analysis of general features of religious policy of the Roman emperor Elagabalus on the base of Roman historians' information, epigraphic and numismatic material. It considers Elagabalus's religious reform as a radical attempt to support syncretic trends in spiritual culture of the Roman Empire.

*Keywords:* religious policy, syncretism, traditionalism, solar cult, the Roman Empire.

*Уводзіны.* Разгляд асноўных асаблівасцей рэлігійнай палітыкі рымскіх імператараў дынастыі Севераў дазваляе стварыць больш аб'ектыўную карціну рэлігійнага жыцця Рымскай імперыі ў III ст. н. э. Класікі рымскага рэлігіязнаўства разглядалі дадзены перыяд як час заняпаду і арыенталізацыі рымскай рэлігіі [1–4]. Гэтыя з'явы духоўнай культуры Старажытнага Рыму заўважны ў распаўсюджванні хрысціянства і містэрыяльных культаў сярод жыхароў імперыі [1, с. 242–243; 2, с. 112–113; 3]. Аднак рэальная карціна рэлігійнай гісторыі Рымскай імперыі III ст. была больш складанай і супярэчлівай [5, с. 427; 6].

Звычайна лічыцца, што рэлігійная палітыка рымскага імператара Элагабала мела цэльны характар і была накіравана на ўсталяванне салярнага монатэізму [7, p. 95–115; 8, p. 45–100]. Даследчык гісторыі антычнай рэлігіі Г. Хальсберг адстойвае думку аб выкарыстанні монатэістычнай тэалогіі эмескага культу ў рэлігійнай рэформе рымскага імператара. Рэлігійныя мерапрыемствы Элагабала па сутнасці папярэднічалі радыкальным крокам у рэлігійнай палітыцы імператара Канстанціна Вялікага [8, p. 79–84]. Гэтыя высновы ўзніклі пад непасрэдным уплывам класічных прац даследчыкаў антычнай рэлігіі Ф. Кюмона і Ф. Альтхейма, якія разглядалі гісторыю салярных культаў у Рымскай імперыі [1, с. 139–175; 4, p. 73–85]. Сучасныя даследчыкі паставілі пад сумнеў дадзеныя высновы аб характары і сутнасці рэлігійнай палітыкі Элагабала. На падставе аналізу эпіграфікі і нумізматыкі яны даказваюць, што рэлігійныя мерапрыемствы рымскага імператара былі непаслядоўнымі і супярэчлівымі [6; 9]. Па-за ўвагай даследчыкаў застаецца праблема суадносін праяў рэлігійнага сінкрэтызму і рымскай традыцыі ў палітыцы імператара Элагабала. Гэта магчыма выявіць пры комплексным аналізе звестак рымскіх гісторыкаў, нумізматычнага і эпіграфічнага матэрыялу.

*Асноўная частка.* Рэлігійная палітыка Элагабала атрымала досыць негатыўную ацэнку ў працах рымскіх гісторыкаў Дыёна Касія і Герадыяна [10, 11]. Стаўленне Дыёна Касія да рэформы Элагабала адлюстроўвае непрыманне палітыкі маладога імператара кансерватыўнымі коламі рымскай эліты (Dio Cass. LXXIX 11) [10, с. 351].

Згодна за звесткамі рымскіх гісторыкаў, Элагабал урачыста прывозіць свяшчэнны камень, або бетыль, сірыйскага салярнага бога у Рым (Dio Cass LXXIX 11; Herodian V 3–5) [10, с. 351; 11, с. 198–203]. Затым рымскі імператар узводзіць храм для сірыйскага бога Elagabalium, у якім праводзіць свяшчэнныя рытуалы па сірыйскім узоры з удзелам прадстаўнікоў рымскай эліты (Herodian V 6; SHA Heliogab., III 4–5) [11, с. 205–208; 12, с. 136]. Потым адбываюцца свяшчэнныя шлюбы, або тэагаміі, салярнага бога з Мінервай, Вестай, а потым з пунічнай багіняй Таніт, якая шанавалася ў Старажытным Рыме пад назвай Dea Caelestis (Herodian V, 6. 3-6) [11, с. 206–207; 6].

Удакладняюць карціну рэлігійнай рэформы Элагабала звесткі нумізматычнага і эпігра-

фічнага матэрыялу. Напачатку рэлігійная палітыка імператара не мела канфліктнага і радыкальнага характару, як гэта апісваюць Дыён Касій, Герадыян і зборнік біяграфій рымскіх імператараў (SHA). Элагабал пачынае сваё кіраванне са звароту да рымскай арміі, аб чым сведчаць легенды: Concordia militium, Fides exercitus, Fides militium і выявы бога Марса з эпітэтам Victor на срэбных манетах (RIC IV. II. Elagabalus. № 60, 66, 72, 119) [13]. На манетах гэтага імператара сустракаюцца выявы рымскіх багінь, якія сімвалізавалі традыцыйныя рымскія цноты і суправаджаліся легендамі Temporum Felicitas, Libertas Augusti, Annona Augusti (RIC IV. II. Elagabalus. № 9, 10, 18, 21, 59, 79, 80, 148) [13]. Магчыма, сям'я імператара імкнулася адаптаваць яго да рэлігійных і культурных традыцый Старажытнага Рыму. Герадыян апісвае значны ўплыў у палітычным жыцці імперыі бабулі імператара Юліі Мезы, якая намагалася прымірыць свайго ўнука з рымскімі традыцыямі (Herodian V, 5. 5) [11, с. 203–204]. Таму зварот да традыцыйных рымскіх каштоўнасцей мусіў сведчыць, што імператар і яго сям'я абяцаюць насельніцтву імперыі свабоду, спакой і дабрабыт.

Нумізматычны матэрыял пацвярджае думку аб асцярожным характары рэлігійнай палітыкі Элагабала ў першыя гады свайго кіравання. На манетах 219–220 гг. н. э. прысутнічаюць выявы Юпітэра, традыцыйнага бога рымскага пантэону, які атрымлівае эпітэт Conservator як ахоўнік рымскага імператара (RIC IV. II. Elagabalus. № 89, 92) [13]. Рымскі сенат абвясціў Элагабала жрацом храма Юпітэра Абаронцы (aedes Jovis Popugnatoris) (CIL, VI. 2009) [14]. Традыцыйныя рымскія багіні Вікторыя, Фартуна, багіня Рома і бог Sol з прамяністай каронай (RIC IV. II. Elagabalus. № 1, 17, 26a) прысутнічаюць на манетах Элагабала [13]. На манетах сонечны бог Sol мае антрапаморфны выгляд, што адпавядае традыцыйным нормам рымскай іканаграфіі гэтага боства. Элагабал напачатку выкарыстоўваў традыцыйны тытул pontifex maximus для рымскіх імператараў (RIC IV. II. Elagabalus. № 4, 11, 25 ) [13]. Выявы традыцыйных рымскіх багінь Венеры, Юноны і Весты сустракаюцца на манетах першай жонкі імператара Карнеліі Юліі Паўлы (RIC IV. II. Elagabalus. № 219, 222, 223) [13]. Саюз Элагабала з прадстаўніцай высакароднай рымскай сям'і мусіў усталяваць палітычны кампраміс з прадстаўнікамі рымскай эліты (Dio Cass. LXXIX, 9) [10, с. 352].

Выкарыстанне традыцыйных багоў рымскага пантэону у рэлігійнай прапагандзе рымскага імператара сведчыць аб імкненні Элагабала адаптавацца да культурных традыцый Старажытнага Рыму. Магчыма, памяркоўная рэлігійная палітыка першых гадоў кіравання імператара праводзілася пад ціскам яго родзічаў. Звесткі рымскіх гісторыкаў і даныя нумізматыкі і эпіграфікі дазваляюць сказаць аб непаслядоўнасці рэлігійнай палітыкі Элагабала ў 218–220 г. н. э. Рымскі імператар аднача-сова дэманструе прыхільнасць да культу эмескага бога, а таксама імкнецца выкарыстоўваць у палітычнай прапагандзе традыцыйных багоў рымскага пантэону [15]. Гэта сведчыць аб пошуку прагматычнага балансу паміж рэлігійным сінкрэтызмам і рымскімі традыцыямі ў рэлігійнай палітыцы імператара. Такі баланс у рэлігійнай палітыцы быў дасягнуты Септыміем Северам і Каракалай, але Элагабал не змог паспяхова працягнуць палітыку сваіх папярэднікаў [1, с. 242–258].

Праз пэўны час Элагабал надае сваім рэлігійным мерапрыемствам радыкальны і канфліктны характар. Змена палітычнай лініі яскрава заўважаецца ў эпіграфічным і нумізматычным матэрыяле. З 220 г. н. э. Элагабал пачынае выкарыстоўваць новыя тытулы для рымскага імператара: sacerdos amplissimus dei invicti Solis Elagabali, што пацвярджаецца эпіграфічнымі звесткамі [6] (CIL II, 921; CIL VII, 585; AE 1936, 85; AE 2000, 1203; AE 2000, 1849) [14]. Новая тытулатура Элагабала прысутнічае на манетах, у якіх імператар названы sacerdos Dei Solis Elagabali, Summus sacerdos Augustus, Invictus sacerdos Augustus (RIC IV. II. Elagabalus. № 191, 194, 200 ) [13]. Сустракаюцца выявы імператара, які здзяйсняе ахвярапрынашэнне у гонар сірыйскага салярнага бога (RIC IV. II. Elagabalus. № 191, 200) [13]. Дадзенымі выявамі Элагабал падкрэслівае свой статус вярхоўнага жраца эмескага бога, якому здзяйсняе свяшчэнныя рытуалы ў сірыйскай вопратцы (Dio Cass. LXXIX, 11; Herodian V 3. 4-11) [15, с. 355; 16, с. 198–199]. На манетах Элагабала прысутнічаюць выявы свяшчэннага каменя сірыйскага бога, які быццам бы кіруе квадрыгай у суправаджэнні арла (RIC IV. II. Elagabalus. № 195) [13]. Арол, згодна з рымскімі традыцыямі, заўжды суправаджаў вярхоўнага бога рымскага пантэону – Юпітэра Капіталійскага (Jupiter Optimus Maximus). Выява арла, які суправаджае бетыль эмескага бога, яскрава дэманструе новы статус эмескага бога. Салярны бог сірыйскай Эмесы становіцца вярхоўным богам Рымскай імперыі. На манетах імператара Элагабала прысутнічаюць антрапаморфныя выявы салярнага бога (Sol Invictus), якія суправаджаюцца легендай Conservator Augusti (RIC IV. II. Elagabalus. № 63) [13]. Дадзены эпітэт часцей адносіўся да Юпітэра Капіталійскага, але рэлігійная рэформа робіць сонечнага бога ў рымскай і сірыйскай варыяцыі новым ахоўнікам рымскага імператара.

У эпіграфічным матэрыяле салярнае боства фігуруе з эпітэтамі: Soli invicto comiti Augusti nostri або Soli Invicto Conservatori Imperatoris Antonini Augusti (CIL II, 921; CIL X, 5331; CIL X, 5827; CIL X, 7337) [14]. Гэтыя сведчанні пацвярджаюць думку, што рымскі імператар узвысіў культ салярнага бога Эмесы, надаўшы яму атрыбуты вярхоўнага бога Рымскай імперыі і асабістага апекуна імператара [15, 16]. Аднак рымскія надпісы з прастораў імперыі не дазваляюць казаць аб шырокім распаўсюджванні сірыйскага культу. Шанавалі эмескага Элагабала, у асноўным, выхадцы з Сірыі, якія служылі ў рымскім войску (CIL III, 2328) [14].

Значную ролю ў рэлігійнай палітыцы Элагабала адыгрывалі свяшчэнныя шлюбы паміж багамі (Dio Cass. LXXIX, 12; Herodian V, 6. 3-6) [10, с. 355; 11, с. 206–207]. Свяшчэнныя шлюбы, або тэагаміі, праводзіліся для таго, каб трансфармаваць рымскі пантэон пад патрэбы рэлігійнай рэформы імператара. Герадыян распавядае аб шлюбе эмескага бога з традыцыйнай рымскай багіняй Мінервай (Афінай), але імператар Элагабал разрывае гэты шлюб, бо багіня не адпавядала свайму мужу з-за сваёй ваяўнічасці (Herodian V, 6. 3-4) [11, с. 206]. Дыён Касій згадвае шлюб салярнага бога Эмесы з рымскай багіняй Вестай, які суправаджаўся саюзам імператара з Аквіліяй Северай. Гэтая жанчына з'яўлялася жрыцай храма Весты (Dio Cass. LXXIX, 9. 3) [10, с. 353]. Шлюб імператара з весталкай груба парушаў свяшчэнныя традыцыі і забароны рымскай рэлігіі. Наступнай жонкай эмескага салярнага бога становіцца пунічная багіня Таніт, якая фігуравала ў Рыме як Dea Caelestis, або ў сінкрэтычнай форме Venus Caelestis (нябесная Венера), Iuno Caelestis (нябесная Юнона), або выступала пад імёнамі Virgo Caelestis, Regina Caelestis (Dio Cass LXXIX, 12; Herodian V, 6. 4–5) [10, с. 355; 11, с. 206; 8, с. 91–92]. Эпіграфічны матэрыял дазваляе казаць, што культ гэтай сінкрэтычнай багіні быў папулярным сярод жыхароў рымскай Італіі (AE 1998, 1538; CIL VIII, 22689; CIL X, 1596;) [14]. Dea Caelestis, або Таніт, мела аракула і галоўнае свяцілішча ў Карфагене, якое ўтрымлівала вялікую колькасць багатых дароў ад шанавальнікаў багіні [8, с. 91–92]. Тэагамія Таніт і салярнага бога Эмесы звязвала культы гэтых боствў, мусіла адаптаваць эмескі культ да рэлігійных вераванняў рымскай Італіі, а таксама палепшыла фінансавае становішча імператара. Надпіс з іспанскай Кардовы пацвярджае факт свяшчэнных шлюбаў салярнага бога. У гэтым надпісы салярны бог фігуруе разам з багіняй Алат, якая была сірыйскім адпаведнікам рымскай Мінервы, і з кіпрыйскай варыяцыяй пунічнай багіні Таніт [6]. Імператар Элагабал намагаўся стварыць новую трыяду вярхоўных багоў рымскага пантэону. Ранейшая традыцыйная капіталійскай трыяда – Юпітэр, Юнона і Мінерва замянялася на трыяду Элагабал, Мінерва (або Веста) і Dea Caelestis.

Канфрантацыя з рымскімі традыцыямі яскрава праяўляецца ва ўсім ходзе рэлігійнай рэформы імператара Элагабала. Рымскі імператар імкнуўся адкрыта падтрымаць сінкрэтычныя тэндэнцыі ў рэлігійным жыцці імперыі і радыкальна абнавіць рымскую рэлігію. Сутнасцю усёй рэлігійнай палітыкі маладога імператара была дэманстрацыя асабістай вернасці салярнаму богу Эмесы, які даў яму ўладу над прасторамі імперыі. Гісторыя Аўгустаў сцвярджае, што Элагабал спрабаваў паглынуць усе магчымыя культы і вераванні Рымскай імперыі культам свайго салярнага бога (SHA Heliogab. III, 5) [12, с. 136]. Дыён Касій абвінавачвае імператара ў тым, што эмескі бог сонца стаў вышэй за Юпітэра, які забяспечыў старажытнаму Рыму яго палітычную і рэлігійную веліч (Dio Cass. LXXIX, 11. 1) [10, с. 352]. Звесткі рымскіх гісторыкаў штурхаюць даследчыкаў антычнай рэлігіі рабіць смелыя высновы аб салярным монатэізме і рэлігійнай рэвалюцыі імператара Элабагала [7, p. 267–288; 8, p. 79–84; 4, p. 82–83]. Характарыстыка рэлігійнай палітыкі Элагабала як першай спробы ўвядзення монатэізму ў імперыі з'яўляецца спрошчанай і памылковай, бо застаюцца па-за ўвагай даныя нумізматыкі і эпіграфікі.

Нумізматычны матэрыял сапраўды дэманструе, што культ эмескага бога займаў цэнтральнае месца ў рэлігійнай палітыцы Элагабала. Выявы на манетах яскрава адлюстроўваюць вярхоўны статус салярнага бога ў Рымскай імперыі. Аднак традыцыйныя багі рымскага пантэону цалкам не знікаюць з чаканкі гэтага імператара падчас правядзення рэлігійнай рэформы. На манетах, прысвечаных родзічам імператара, прысутнічаюць выявы багінь Венеры, Весты, Кібелы, культ якой таксама быў адаптаваны да рымскай рэлігійнай традыцыі (RIC IV. II. Elagabalus №№. 219, 222, 224, 230–231, 400) [13]. Цікавыя звесткі дае чаканка ўсходніх правінцый Рымскай імперыі, якая сведчыць аб папулярнасці грэчаскіх і мясцовых багоў. Сярод правінцыйных манет сустракаюцца выявы эмескага бетыля, галоўнага атрыбуту культу салярнага бога (RPC VI Elagabalus №№. 4748, 4871, 10079, 10789) [17]. На манетах прысутнічаюць выявы грэчаскага сонечнага бога Геліяса, іканаграфія якога аналагічна рымскаму Sol Invictus (RPC VI Elagabalus №№. 4492, 4489, 4490, 4504) [17].

Эпіграфічны матэрыял сведчыць, што сярод надпісаў, якія пасвячаліся за здароўе і бя-

УМК БГПУ

спеку імператара, фігуруюць традыцыйныя рымскія багі, а таксама багі містычных культаў і мясцовыя боствы. Сярод традыцыйных рымскіх багоў часцей узгадваюцца Марс (Mars Victor) (AE 1988, 984), Дыяна (Diana Aeterna) (CIL III, 6161), Юпітэр у надпісах з рымскай правінцыі Мезіі (AE 1950, 238; CIL III, 1674) [13]. Жыхары Італіі шанаванні Геркулеса ў рымскай і сінкрэтычнай рымска-кельцкай форме (CIL VI, 323, 31162) [13]. У надпісах заўважны імёны рымскай Юноны (AE 1978, 551; CIL XIII, 6559), Мітры ( CIL XI, 5736), Ісіды (AE 1990, 778) [13].

*Заключэнне.* Рэлігійная рэформа імператара Элагабала насіла радыкальны характар, што непазбежна выклікала негатыўную рэакцыю палітычнай эліты Старажытнага Рыму. Аднак першапачаткова Элагабал спрабаваў працягнуць палітычную лінію першых прадстаўнікоў дынастыі Севераў ў рэлігійнай сферы. Аўтарытэт родзічаў імператара не змог утрымаць яго ад далейшых радыкальных крокаў у рэлігійнай палітыцы. Пры правядзенні рэлігійнай рэформы імператар зрабіў эмескага бога вярхоўным богам рымскага пантэону. Імператар Элагабал праводзіў свяшчэнныя шлюбы паміж багамі, каб абнавіць трыяду вярхоўных багоў Рымскай імперыі. Спробы імператара абнавіць рымскую рэлігію, выкарыстоўваючы эмескі салярны культ і свяшчэнныя шлюбы, сведчыць аб радыкальнай мадэлі рэлігійнага сінкрэтызму ў палітыцы Элагабала. Імператар не адаптаваў культ эмескага бога пад традыцыі рымскай рэлігіі, хаця звяртаўся ў палітычнай прапагандзе да традыцыйных рымскіх багоў. Аднак культ салярнага бога Эмесы заставаўся сірыйскім культам і не мог ахапіць значную частку насельніцтва імперыі. Імператар Элагабал не змог знайсці прагматычны баланс паміж сінкрэтызмам і рымскай традыцыяй у сваёй рэлігійнай палітыцы.

УМШ БДПУ

*Літаратура*


1. *Кюмон, Ф.* Восточные религии в римском язычестве / Ф. Кюмон ; пер с франц. А. П. Сапиной. – СПб. : Евразия, 2001. – 352 с.
2. *Корелин, М. С.* Падение античного миросозерцания. Культурный кризис в Римской империи / М. С. Корелин. – СПб. : Изд. дом «Коло», 2005.
3. *Ревилль, Ж.* Религия в Риме при Северах / Ж. Ревилль ; пер. с франц. В. И Ленца. – М. : Книжное дело, 1898. – 320 с.
4. *Altheim, F*. Deus invictus. Le religioni e la fine del mondo antico / F. Altheim. – Roma : Edizione Mediterranee, 2007. – 185 p.
5. *Амбрамзон, М. Г*. Монеты как средство пропаганды официальной политики Римской империи / М. Г. Амбрамзон. – М.,1995. – 656 с.
6. *Icks, M.* Priesthood and Imperial Power. The Religious Reforms of Heliogabalus, 220-222 AD. / M. Icks // The impact of imperial Rome on Religions, Ritual and Religios life in the Roman Impire / ed. L. de Blois, P. Funke. – Leiden. Boston : Brill, 2006. P. 169- 179.
7. *Hay, J. S.* The Amazing Emperor Heliogabalus / J. S. Hay. – London : Macmillan, 1911. 366 p.
8. *Halsberghe, G. H*. The cult of Sol Invictus / G. H- Halsberge. – Leiden : E. J. Brill, 1972. – 192 p.
9. *Badaracco E*. Il culto del Deus Elagabalus dal I al III secolo d. C. Attraverso le testimonianze epigrafiche, letterarie e numistatiche. Tesi di dottorato. Sassari. Universita di Sassari, 2015.
10. Кассий Дион Коккейан. Римская история. Книги LXIV-LXXX / пер. с древнегреч. А. В. Махлаюка. – СПб. : Филфак СПбГУ, 2011. – 456.
11. Геродиан. История императорской власти после Марка в восьми книгах / пер. с древнегреч. А. И. Доватура [и др.]. – СПб. : Алетейя, 1995. – 289.
12. Властелины Рима. Биография римских императоров от Адриана до Диоклетиана / пер с лат. С. П. Кондратьева. – СПб. : Алетейя, 2001. – 384 с.
13. The Roman Imperial Coinage (RIC): in 10 v. / ed. H Mattingly, E. A. Sydenham. – London: Spink&Son, 1936–1994. – Vol IV. Part 2. – 1938 – 240 p.


*References*


1. *Kyumon, F*. Vostochnye religii v rimskom yazychestve / F. Kyumon ; per s franc. A. P. Sapinoj. – SPb. : Evraziya, 2001. – 352 s.
2. *Korelin, M. S.* Padenie antichnogo mirosozercaniya. Kul'turnyj krizis v Rimskoj imperii / M. S. Korelin. – SPb. : Izd. dom «Kolo», 2005.
3. *Revill', Zh.* Religiya v Rime pri Severah / Zh. Revill' ; per. s franc. V. I Lenca. – M. : Knizhnoe delo, 1898. – 320 s.
4. *Altheim, F*. Deus invictus. Le religioni e la fine del mondo antico / F. Altheim. – Roma : Edizione Mediterranee, 2007. – 185 p.
5. *Ambramzon, M. G.* Monety kak sredstvo propagandy oficial'noj politiki Rimskoj imperii / M. G. Ambramzon. – M.,1995. – 656 s.
6. *Icks, M.* Priesthood and Imperial Power. The Religious Reforms of Heliogabalus, 220-222 AD. / M. Icks // The impact of imperial Rome on Religions, Ritual and Religios life in the Roman Impire / ed. L. de Blois, P. Funke. – Leiden. Boston : Brill, 2006. P. 169- 179.
7. *Hay, J. S.* The Amazing Emperor Heliogabalus / J. S. Hay. – London : Macmillan, 1911. 366 p.
8. *Halsberghe, G. H*. The cult of Sol Invictus / G. H- Halsberge. – Leiden : E. J. Brill, 1972. – 192 p.
9. *Badaracco E*. Il culto del Deus Elagabalus dal I al III secolo d. C. Attraverso le testimonianze epigrafiche, letterarie e numistatiche. Tesi di dottorato. Sassari. Universita di Sassari, 2015.
10. Kassij Dion Kokkejan. Rimskaya istoriya. Knigi LXIV-LXXX / per. s drevnegrech. A. V. Mahlayuka. – SPb. : Filfak SPbGU, 2011. – 456.
11. Gerodian. Istoriya imperatorskoj vlasti posle Marka v vos'mi knigah / per. s drevnegrech. A. I. Dovatura [i dr.]. – SPb. : Aletejya, 1995. – 289.
12. Vlasteliny Rima. Biografiya rimskih imperatorov ot Adriana do Diokletiana / per s lat. S. P. Kondrat'eva. – SPb. : Aletejya, 2001. – 384 s.
13. The Roman Imperial Coinage (RIC): in 10 v. / ed. H Mattingly, E. A. Sydenham. – London: Spink&Son, 1936–1994. – Vol IV. Part 2. – 1938 – 240 p.

14. Epigraphik-Datebank [risorsa elettronico]. – Modalità d'acceso: http://www.manfredclauss.de/gb/index.html. – Data d'acceso: 01.05.2021.
15. *Icks, M.* The Crimes of Elagabalus. The Life and Legacy of Rome's Decadent Boy Emperor / M. Icks. – New York, London : I. B. Tauris, 2011. – 290 pp 16.
16. *Kemezis, A.* The Fall of Elagabalus as Literary Narrative and Political Reality / A. Kemezis // Historia. – 2016. – Vol. 65, iss. 3.- P. 348–390.
17. Roman Provincial Coinage online (RPC) [Electronic resource]. – Mode of access: https://rpc.ashmus.ox.ac.uk/. – Date of access: 28.05.2021.

14. Epigraphik-Datebank [risorsa elettronico]. – Modalità d'acceso: http://www.manfredclauss.de/gb/index.html. – Data d'acceso: 01.05.2021.
15. *Icks, M.* The Crimes of Elagabalus. The Life and Legacy of Rome's Decadent Boy Emperor / M. Icks. – New York, London : I. B. Tauris, 2011. – 290 pp 16.
16. *Kemezis, A.* The Fall of Elagabalus as Literary Narrative and Political Reality / A. Kemezis // Historia. – 2016. – Vol. 65, iss. 3.- P. 348–390.
17. Roman Provincial Coinage online (RPC) [Electronic resource]. – Mode of access: https://rpc.ashmus.ox.ac.uk/. – Date of access: 28.05.2021.

УИЦ БГПУ